У паход – балоты

ГЭТЫ ГОД — ЗНАЧНЫ ДЛЯ ЭКОЛАГАЎ УСЁЙ ПЛАНЕТЫ. СПАЎНЯЕЦЦА 40 ГАДОЎ З ДНЯ ПАДПІСАННЯ РАМСАРСКАЙ КАНВЕНЦЫІ. БЕЛАРУСЬ, БАЛОТЫ ЯКОЙ НАЗЫВАЮЦЬ “ЛЁГКІМІ ЕЎРОПЫ”, ДАЛУЧЫЛАСЯ ДА КАНВЕНЦЫІ ЯК НЕЗАЛЕЖНАЯ ДЗЯРЖАВАЎ 1999 ГОДЗЕ.

На міжнародную кан ферэнцыю ў Мінску, прысвечаную юбі лейнай даце, збяруцца прадстаўнікі Украіны, Расіі, Літвы, Латвіі, Польшчы, Германіі і іншых дзяржаў. У цэнтры ўвагі арганізатараў і гасцей форуму будзе стан адной з асноўных экалагічных сістэм планеты, якая шмат у чым вызначаеяе клімат і біялагічную разнастайнасць.

АСТРАЎКІ НЕКРАНУТАЙ ПРЫРОДЫ

Значэнне балот для Зямлі цяжка пераацаніць. Яны паглынаюць вуглякіслы газ і выпрацоўваюць кісларод, фарміруюць клімат і падтрымлінаюць біялагічную раўнавагу ў прыродзе. Асабліва ўнікальныя нізінныя балоты. У Еўропе такіх практычна не засталося. У Беларусі гэта — Спораўскае і Званец у Брэсцкай вобласці. Яны захаваліся ў першародным стане. Менавіта гэтыя тэрыторыі з'яўпяюцца месцам гнездавання рэдкіх птушак і знаходжання раслін. Тут гняздуецца больш за 50 працэнтаў сусветнай папуляцыі рэдкай цяпер птушкі — вяртлявай чарацянкі і каля 10 працэнтаў еўрапейскай папуляцыі вялікага падворліка. Наогул, 70 працэнтаў прадстаўнікоў флоры і фаўны, занесеных у Чырвоную кнігу, сканцэнтравана менавіта на балотах. І жывёлы, птушкі, расліны з'яўляюцца своеасаблівым індыкатарам іх стаку. Да прыкдаду, летась у спіс відаў, якім пагражае знікненне, навукоўцы дабавілі птушку, якая жыве на адкрытых верхавых балотах, пазбаўленых расліннасці, — вялікага краншнэпа. З-за таго, што на некаторых балотах парушаны гідралагічны рэжым, яны сталі надсыхаць і зарастаць хвояй. Гэта адразу адбілася на колькасці вялікага краншнэпа. Менш стала цецерука і глушца.

Яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя ў Беларусі было 2,9 мільёна гектараў натуральных балот. Але ў 60-я гады іх сталі актыўна асушваць. Меліярацыя змяніла Палессе: тут з'явіліся дарогі, развівалася інфраструктура. А а негатыўных наступствах для экалогіі тады ніхто не думаў. Цяпер у Беларусі засталося 860 тысяч гектараў балот. Але на 60 працэнтах гэтых тэрыторый, паводле слоў загадчыка сектара між-народнага супрацоўніцтва Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах Аляксандра Казуліна, у рознай ступені ўжо парушаны гідралагічны рэжым. Гэта паказала нядаўна праведзеная з выкарысганнем касмічнай здымкі інвентарызацыя балот. Акрамя таго, есць яшчэ 500 тысяч гектараў дэградзіраванай багны. Гэта фактычна мёртвыя тэрыторыі, 90 працэнтаў якіх прыпадае на выпрацаваныя тарфянікі. 300 тысяч гектараў ператварыліся ў пяскі. Сельгаспрадпрыемствы, якія перасталі атрымліваць там ураджаі, адмовіліся ад іх апрацоўкі. І гэтыя землі сталі небяспечнымі крыніцамі пажараў. Да прыкладу, у 2002 годзе менавіта з іх пачыналіся тарфяныя пажары, якія бушавалі затым па ўсей тэрыторыі Беларусі. На іх тушэнне дзяржава патраціла тады каля 1,5 мільёна долараў.

Паводле ацэнкі эколагаў, самым эфекгыўным спосабам выкарыстання гэтых тэрыторый з'яўляецца паўторнае забалочванне. Эканамічную ныгаду ад гэтай зямлі ўсё роўна ўжо не атрымаць. А адроджанае балота прынясе экалагічную карысць не толькі краіне, але і планеце ў цэлым. Тут зноў з'явяцца рэдкія віды раслін і жывёл, будуць умовы для рыбалкі і палявання.

ГРОШЫ-У БАГНЕ

Паводле слоў начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Наталлі Мінчанка, у Беларусі ўжо ёсць вопыт аднаўлення асушаных балот. Дапамагаюць у гэтым розныя міжнародныя арганізацыі. У Еўропе,

дзе балоты былі асушаныя намнога раней, іх аднаўленне абыходзіцца значна даражэй. Паміж тым стан балот, на тэрыторыі якой бы краіны яны ні знаходзіліся, уплывае на экалогію ўсёй планеты. У 2006 годзе мільён долараў на аднаўленне беларускіх балот вылучыў Глабальны экалагічны фонд. У выніку былі паўторна забалочаныя 28 тысяч гектараў.

Першым было адноўлена Дакудаўскае балота пад Лідай у Гродзенскай вобласці. 3000 гектараў выпрацзваных тарфянікаў у цёплы час года дастаўлялі нямала непрыемнасцяў мясцовым жыхарам. Балота штогод гарэла, ахутваючы ўдушлівым смогам горад і наваколлі. Акрамя таго, там часта ўзнікалі пясчаныя буры. У 2007 годзе балота пачалі аднаўляць. Пасля закрыцця каналаў, якія асушалі яго, паднялася вада, ёю напоўніўся тарфяны пласт, пайшла ў рост трава. Сёння гэта месца — аблюбаваны куток рыбакоў, адпачывальнікаў. Аб пажарах і пяшчаных бурах тут даўно забылі. Цана пытання — у сярэднім 50 долараў на гектар. Не так і шмат, калі параўнаць з расходамі на штогадовае тушэнне пажараў... Да таго ж гэта эканамічна апраўданае ўкладанне сродкаў у заб-спячэнне стабілізацыі клімату. Праект, які ажыццяўляецца ГЭФ сумесна з Міністэрствам лясной гаспадаркі, ахапіў 15 выпрацаваных тарфянікаў на тэрыторыі 12 лясгасаў.

Ён стаў шмат у чым унікальным. У 2006 годзе, калі спецыялісты рыхтаваліся да аднаўлення першай праектнай тэрыторыі, вопыту падобнай работы не было ні ў Беларусі, ні за мяжой. Хоць спробы знайсці прымяненне дэградэіраваным тарфянікам рабіліся і раней. Спрабавалі перадаваць іхдля вядзення сельскай і лясной гаспадаркі. Але вырасціць добры ўраджай на такіх землях не ўдавалася, а лес, які ледзь падымаўся, гінуў ад пажараў.

У 2008 годзе пры садзейнічанні кліматычнага фонду Германіі пачалася рэалізацыя новай праграмы "Клімат і біяразнастайнасць", якая называецца яшчэ "Беларусь-1", адным з пунктаў якой стала прадаўжэнне работ па аднаўленні балот. Аб'ём фінансавання нямецкім бокам склаў больш як мільён еўра. Паводле слоў Аляксандра Казуліна, разам з аднаўленнем балот у рамках гэтага праекта прапрацоўваецца пытанне аб продажы нашай краінай квот па парніковых газах. Сутнасць такая. Кожнай краіне вылучаецца пэўная квота: яна можа выдзеліць у атмасферу пэўную колькасць вуглякіслага газу. Хто не ўкладваецца ў квоты, плаціць велізарныя штрафы. Каб не скарачаць сваю прамысловасць, такія дзяржавы могуць купіць квоты ў іншай краіны. Напрыклад, у Беларусі. Наша краіна менш выдзяляе ў атмасферу парніковых газаў. Да таго ж з-за паўторнага забалочвання тэрыторый актывізуецца паглынанне вуглякіслага газу. У выніку частку квот мы можам прадаць. І чым больш адновім балот — тым больш квот у нас будзе для свабоднага продажу. Гаворка ідзе аб гадавым прыбытку ў мільёны еўра.

ПАЛЕСКІМІ СЦЕЖКАМІ

Адзін з раёнаў Беларусі, які мае глабальную значнасць для Зямлі, — Палессе. Тут знаходзяцца 4 буйныя заказнікі — "Сярэдняя Прыпяць", "Званец", "Спораўскі", "Простыр". Усе яны з'яўляюцца Ключавымі арніталагічнымі тэрыторыямі і Рамсарскімі ўгоддзямі. Па ініцыятыве Урада Беларусі і Глабальнага экалагічнага фонду 5-ы год рэалізуецца сумесны праект ГЭФ, Праграмы развіцця ААН і Мінпрыроды коштам 2 мільёны 200 тысяч долараў. Ён накіраваны на ўстойлівае функцыянаванне сістэмы ахоўных водна-балотных угоддзяў у Палескім рэгіене.

Гэта тэрыторыя мае сваю спецыфіку. Пасля маштабнай меліярацыі 60—70 гадоў мінулага стагоддзя тут былі асушаныя многія дробназалежныя тарфянікі. Пасля на гэтых землях сельскагаспадарчыя прадпрыемствы не адзін год апрацоўвалі абганяльныя культуры. Пасля 15—20 гадоў такога выкарыстання прадукцыйнасць палеў звялася да мінімуму. Яны па-ранейшаму былі ў севазвароце гаспадарак, хоць гэта і стала эканамічна нявыгад-ным. Падчас рэалізацыі праекта былі распрацаваныя прапановы па змене напрамку выкарыстання выпрацаваных тарфянікаў. Паводле слоў кіраўніка праекта Генадзя Арцюшэўскага, частку земляў рэкамендавана аддаць пад лугі, частку — пад лес, частку над паўторнае забалочванне. З аднаго боку, гата зменшыць непрадуктыўныя выдаткі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, з

іншага — аздаровіць экалогію ў рэгіёне. Прапановы для кожнага раена былі адобраныя мясцовай уладай. Праз 5 гадоў трэба будзе ацаніць іх эфектыўнасць. Характэрна, што пілотныя пошукі ў рамках праекта атрымалі распаўсюджванне ў краіне. Цяпер Дзяржаўны камітэт па маёмасці распрацоўвае падобныя схемы землекарыстання для 25 раёнаў Беларусі. Асобная тэма праекта — польдары. У сельскай гаспадарцы яны выкарыстоўваліся ў 70—80-я гады мінулага стагоддзя. Але з-за нізкай урадлівасці глебы і парушэнняў гідралагічнага рэжыму ўраджаі тут невысокія. Заглейваецца і зарастае меліярацыйная сетка, польдары пакрываюцца хмызнякамі і, па сутнасці, выбываюць з сельскагаспадарчага абароту. У той жа час страчана і іх экалагічная значнасць. У свой час яны ствараліся на месцы ранейшых нерасцілішчаў рыбы ў пойме ракі Прыпяць. Каб атрымліваць ад іх карысць, былі зробленыя 2 пілотныя праекты на агульнай плошчы звыш 3 тысяч гектараў.

— На месцы аднаго польдара мы паказалі магчымасць яго выкарыстання як нерасцілішча для рыбы, а таксама як месца для вытворчасці зялёных кармоў — сенажаці, — расказвае Генадзь Арцюшэўскі. — Другі польдар — на мяжы Пінскага і Лунінецкага раёнаў — не выкарыстоўваўся ніякім чынам ужо гадоў 30. Хоць там 3 тысячы гектараў поймы, якія можна выгадна выкарыстоўваць. Мы паспрабавалі ўзнавіць там гідралагічны рэжым, блізкі да натуральнага. У выніку там паспяхова прайшоў нераст шчупака, язя, іншай рыбы. Акрамя таго, ён стаў прывабным месцам для гнездавання водна-балотных птушак.

Натуральна, праект не абышоў бокам і інтарэсы мясцовага насельніцтва, яго занятасці. На базе заказнікаў створаныя 4 эколага - адукацыйныя цэнтры ў Бярозаўскім, Драгічынскім, Лунінецкімі Столінскім раёнах. Распрацаваныя і добраўнарадкаваныя 5 экалагічных сцежак.

Паспяхова рэалізаваныя 15 мясцовых мікрапраектаў экатурыстычнай скіраванасці. Яны забяспечваюць камфортнае пражыванне і якаснае турыстычнае абслугоўванне ў рэгіёне. У канцы года рэалізацыя праекта завершыцца.

УЛІК І КАНТРОЛЬ

Біялагічная разнастайнасць планеты — пад пагрозай. Паводле прагнозаў навукоўцаў, да сярэдзіны стагоддзя 15—40 працэнтаў відаў жывёл і раслін на Зямлі могуць апынуцца на грані знікнення. Насельнікі водна-балотных угоддзяў патрабуюць асаблівай увагі.

Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Праграма развіцця ААН у Рэспубліцы Беларусь, Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук па біярэсурсах цяпер рыхтуюць новы праект — "Устойлівае выкарыстанне тарфянікаў у Беларусі". Яго мэта, паводле слоў Аляксандра Казуліна, — распрацоўка стратэгіі ўстойлівага развіцця балот. Плануецца правесці іх комплексную інвентарызацыю. Будуць прааналізаваныя ўсе нюансы: колькасць торфу, якія віды флоры і фаўны там ёсць, якія функцыі таго ці іншага балота ў рэгіянальным і глабальным маштабе. У ацэнцы будуць удзельнічаць прадстаўнікі розных міністэрстваў; прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, энергетыкі, сельскай гаспадаркі і харчавання. Плануецца скласці спіс усіх балот і на аснове дэталёвых ацэнак вызначыць напрамак выкарыстання для кожнага. Дзесьці можна будзе здабываць торф, дзесьці зрабіць заказнік, дзесьці правесці ахоўныя мерапрыемствы супраць пажарнай небяспекі.

Кошт новага праекта — 2,7 мільёна долараў. КрынІца — фінансаванне міжнародных экалагічных арганізацый. Акрамя гэтага, каля 7 мільенаў долараў паступіць па лініі нацыянальнай дзяржаўнай праграмы па аднаўленні меліяраваных земляў. Гэта будзе самы маштабны праект, які датычыцца беларускіх балот. Да канца 2012 года скончыцца распрацоўка. А ў 2013 можа пачацца рэалізацыя. Навукоўцы ўпэўненыя: самаадчуванне "лёгкіх Еўропы" ад гэтага прыкметна палепшыцца.

Лілія Хлыстун

Источник: Беларусь.-2011.-№10.-С.22-24.